“Мова — гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ”, - пісаў калісьці Іван Мележ. Узгадваючы словы вядомага пісьменніка, зноў і зноў мы звяртаемся да нашай мовы, да яе багатай скарбніцы, каб дастаць адтуль самыя сакавітыя словы і зацікавіць імі сучасных школьнікаў.

4 мая 2023 года прайшло мерапрыемства з вучнямі 7 класа “Мова: цікава і займальна”. Яго мэты: дапамагчы вучням асэнсаваць ролю мовы ў жыцці чалавека і нашага грамадства, пазнаёміцца з цікавымі беларускімі словамі, навучыцца ўжываць іх у рознай маўленчай сітуацыі. У ходзе мерапрыемства вучні “адкрывалі” для сябе розныя словы – назвы беларускага адзення, спрабавалі ўжываць “новыя” словы ў размове з сябрамі і роднымі. Напрыканцы падарожжа кожны школьнік падарыў свайму аднакласніку адно “новае” слова, а сабе добры настрой на ўвесь дзень.

І.У. Дорахава

